Источник: **«Голас Радзімы» - 2013-01-11**

# У кнігах досвед застанецца



**Беларускія вучоныя — аўтары шэрагу цікавых выданняў, што прыйшлі да чытача ў 2012 годзе**

Творчая сустрэча "Кніжны калейдаскоп беларускай навукі", прысвечаная Году кнігі, ладзілася ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук. Паразважаць пра набыткі, падзяліцца планамі сабраліся навукоўцы і супрацоўнікі акадэмічнага Выдавецкага дома. Была разгорнута выстава "Год кнігі Выдавецкага дома "Беларуская навука": амаль 100 выданняў, плён працы ў 2012-м. Пра сумесныя праекты навукоўцаў і Выдавецкага дома расказваў і спецыяльны відэафільм.



Пачынаючы размову, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук, доктар навук, прафесар Аляксандр Каваленя адзначыў: выданне салідных тамоў, манаграфій, якія рыхтуюць навукоўцы — справа не танная. Гэта не камерцыйныя выданні, грошай на іх не заробіш. Аднак даследаванні па гісторыі, культуры Беларусі, у іншых галінах ведаў вельмі патрэбныя, бо "яны ўмацоўваюць і ўпрыгожваюць наш Беларускі Дом, павышаюць прэстыж краіны". Пры падтрымцы дзяржавы вынікі дзейнасці вучоных увасабляюцца не толькі ў справаздачах: да чытачоў прыходзяць штогод дзясяткі цікавых кніг. Прычым яны даступныя па кошце і для школьных бібліятэк. Сярод праектаў, здзейсненых у 2012-м, — падрыхтаванае ў Інстытуце гісторыі выданне "Археалагічная спадчына Беларусі". Багата ілюстраваны альбом знаёміць чытачоў з багаццем, асаблівасцямі культуры беларускіх зямель з даўніны да канца XVIII стагоддзя. Такая міні-энцыклапедыя, лічыць акадэмік, як і шэраг іншых кніг Выдавецкага дома, робіць гонар і вучоным, і выдаўцам, і краіне. Творчым подзігам назваў выступоўца плён працы доктара філалагічных навук

Міхася Мушынскага, які шмат гадоў шчыраваў над кнігай “Летапіс жыцця і творчасці Якуба Коласа” — і вось фаліянт на 1000 старонак прыйшоў да чытачоў.

Акадэмік задаволены, што ў моладзі ёсць цікавасць да гісторыі Бацькаўшчыны, а ў рэгіёнах, райцэнтрах ладзяцца навуковыя канферэнцыі. Працуюць на карысць Айчыны ў гістарычным рэчышчы і энтузіясты. Аляксандр Каваленя ўручыў Ганаровую грамату Аддзялення гуманітарных навук і мастацтва НАН Анатолю Статкевічу-Чабаганаву. Ён не гісторык па адукацыі, але мае аўтарытэт сярод навукоўцаў. Пісьменнік, аўтар шэрагу тамоў кніг “Я — сын Ваш” з серыі “Летапіс беларускай шляхты” ўшанаваны за значны ўклад у даследаванне беларускай генеалогіі і захаванне гісторычна-культурнай спадчыны Беларусі.

Дырэктар Інстытута гісторыі Вячаслаў Даніловіч, дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Аляксандр Лакотка, галоўны рэдактар Выдавецкага дома “Беларуская навука” Георгій Кісялёў расказалі, якія кнігі запланаваны да выдання ў 2013 годзе.

**Іван Ждановіч**

На здымках:
**На выставе — плён працы Выдавецкага дома “Беларуская навука”; Акадэмік-сакратар Аляксандр Каваленя ўручае грамату пісьменніку Анатолю Статкевічу-Чабаганаву**